■ Не абмініце!

# ПРЭМ'ЕРА З АЗЕРБАЙДЖАНСКІМ АКЦЭНТАМ

## Славуты балет «Каханне і смерць» у Вялікім

**Музыка, напоўненая распаленымі, прычым у розных дыяпазонах, эмоцыямі, філасофскім падтэкстам і ўсходнім каларытам, ды яшчэ тая, што гаворыць нам пра вечнае, — так каротка можна апісаць балет «Каханне і смерць» Палада Бюльбюль аглы, кампазітара, спевака, грамадскага дзеяча і дыпламата. Нават трынаццаць стагоддзяў не перашкодзяць зразумець пастаноўку сёння. Аснова — помнік сусветнай літаратуры. Прэм'ера стане пастаноўкай-адкрыццём «Балетнага лета ў Вялікім» і пройдзе на сцэне 11 і 12 чэрвеня.**



— Балет напісаны па матывах нацыянальнага азербайджанскага эпасу «Кітабі Дэдэ Каркут» («Кніга майго дзеда Каркута»), створанага больш як 1300 гадоў таму. Калі мы адзначалі яго юбілей, што грымеў па ўсім свеце, выдаваліся энцыклапедыі, каталогі і альманахі. Я, калі быў міністрам культуры Азербайджана, удзельнічаў у гэтай працы. І падумаў: чаму б на такую тэму не стварыць буйны эпічны твор, але на гэты раз музычны?.. Чаму балет? Ён дае больш магчымасцяў для фантазіі і суперажывання. Пісаў музыку амаль тры гады. Хацеў, каб кожны глядач задумаўся. Таму і тэмы ў пастаноўцы тыя, што хвалююць усіх, — каханне, якое часам мяжуе з нянавісцю, і смерць, што альбо дае табе шанц на доўгія гады, альбо спапяляе хутка і нечакана... Што там, за мяжой, ніхто не ведае, таму паразважаць пра гэта заўсёды цікава, — адзначыў кампазітар.

Палад Бюльбюль аглы, сёння Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Азербайджанскай Рэспублікі ў Расійскай Федэрацыі, звярнуў увагу таксама на каштоўнасць супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Азербайджанам не толькі ў эканамічнай і сацыяльнай, але і культурнай сферы, творчым рэчышчы. Тэатр, паводле яго слоў, таксама паказчык добрых адносін народаў да міру і дружбы.

**«Тэмы ў пастаноўцы тыя, што хвалююць усіх, — каханне, якое часам мяжуе з нянавісцю, і смерць, што альбо дае табе шанц на доўгія гады, альбо спапяляе хутка і нечакана...»**

Прэм'ера абяцае быць вельмі каларытнай. У тым ліку і дзякуючы касцюмам, створаным Кацярынай Булгакавай. Будуць два дырыжоры — Эюб Куліеў і Андрэй Іваноў. Сцэнаграфія — у руках галоўнага мастака Вялікага тэатра Аляксандра Касцючэнкі. Харэограф-пастаноўшчык — Вольга Кастэль.

**Марыя ВОЙЦІК**

# «ГАВАРАЦЬ ПРА ТЭАТР, ЯК ГРЭКІ, А СТАВЯЦЦА, ЯК РЫМЛЯНЕ»

**Якаў НАТАПАЎ вядомы ў Гомелі і як былы акцёр і рэжысёр Гомельскага абласнога драматычнага тэатра, і як адзін са стваральнікаў і мастацкі кіраўнік тады прыватнага Незалежнага тэатра — цяпер дзяржаўнага Гомельскага гарадскога маладзёжнага тэатра, дзе ён рыхтуе да выпуску чарговую прэм'еру.**



***— Якаў Васілевіч, раскажыце, чаму вы ўзялі дастаткова даўнюю і вядомую, шмат разоў увасобленую на сцэне і нават у кіно п'есу Валодзіна «З каханымі не расставайцеся»?***

— Таму што ёсць што дадаць! Валодзін — проста выдатны аўтар, і ён, як класік, існуе ва ўсе часы. І ёсць пытанні, на якія да гэтага часу няма адказаў. У свой час у Таўстаногава спыталі, чаму ён не ставіць «Караля Ліра». Ён адказаў, што паглядзеў пастаноўку Пітэра Брука, і яму няма чаго дадаць. Тое, што я глядзеў з пастановак п'есы Валодзіна, дазваляе мне сказаць, што мне ёсць што дадаць. Не буду казаць канкрэтна да прэм'еры.

***— Хто заняты ў новым спектаклі?***

— Ёсць маладыя і таленавітыя: Ірына Шапецька, Віталь Сазонаў, Ірына Конік — галоўныя героі. Ёсць яшчэ адзін персанаж, які з'яўляецца ў мяне, — лекар, свайго роду Мефістофель гэтага дзейства. Я яго «выцягнуў» і ўвасабляю як нейкага ўнутранага ворага чалавецтва, у якім спалучаюцца эгаізм, амбіцыі, абсурднасць сітуацыі і цынізм. Я даверыў гэтую складаную ролю Дзмітрыю Попчанку. У аўтара ёсць персанаж Кірылашвілі — яго будзе іграць новы акцёр, грузін Георгі Чантурыя. Выдатная ўзроставая роля ў актрысы старэйшага пакалення Галіны Шырокшынай. Занятая практычна ўся трупа тэатра.

***— У XXI стагоддзі былы савецкі тэатр «матэрыялізаваўся». Звыклым стала ўжываць для яго ацэнкі грошы — як адзнаку поспеху. Але ці прыстойна гэта?***

— Праблемы тэатральнага сённяшнія шматслаёвыя, але трэба вылучыць два пункты. Што трэба, каб быў добры тэатр? Фінансаванне і талент! Прычым менавіта ў такой паслядоўнасці — спачатку грошы, потым талент. Талент без падтрымкі проста глухне.

***— Вы ставілі спектаклі ў 1990-я. І ставіце цяпер. Як бы назвалі перыяд другога дзесяцігоддзя XXI стагоддзя і чым ён вылучаецца?***

— Яго адрозненне ў нейкай замкнёнасці. Калі ў савецкі час людзі з Маскоўскага камітэта культуры маглі сказаць у кулуарах: «Дрэнны тэатр стаў Маскоўскі «Ленком» пасля знявага рэжысёра Эфраса», але яны не маглі гэта сказаць прама. Сёння можна казаць усё, што хочаш. І гэты ўнутраны цынізм выліваецца ў абсалютна шчыры знешні. Гэта нагадвае мне гісторыю. Калі грэкі да акцёраў і да тэатра ставіліся вельмі трапятліва. А рымляне імі пагарджалі. Дык вось у наш час гавораць пра тэатр, як грэкі, а ставяцца, як рымляне!

***— У той жа час камерцыйныя амерыканскія тэатр і кінематограф добра сябе зарэкамендавалі, таму што вымушана навучыліся добра пісаць і добра ставіць?***

— Яны абсалютна разняволеныя. Я не за такое мастацтва. Людзей пастаянна цягне да нейкай «чарнухі». Калі будуць выходзіць на сцэну аголеныя людзі і рабіць абы-што... Гэта будзе ўжо не тэатр. Таму камерцыйны тэатр Амерыкі і тэатр Беларусі ці нават Расіі — надзвычай розныя.

***— Чаму? У амерыканцаў ёсць і глыбока псіхалагічныя творы, сямейныя, сацыяльныя, панарамныя.***

— Напэўна, у іх іншы ўзровень жыцця. Калі там квіток у тэатр каштуе 100 долараў, гэта лічыцца абсалютна нармальным. Гэта нядорага. Працэнтныя суадносіны выдаткаў на культуру ў прыбытку іншыя. Трэба гэта ўлічваць, каб не трапляць у становішча Элачкі-людаедачкі, якая спаборнічае з Вандэрбільдзіхай.

**НАША ДАВЕДКА**

**Якаў Натапаў у 1974 годзе скончыў акцёрскае, а ў 1984-м — рэжысёрскае аддзяленні Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута (БДАМ). Ставіў спектаклі ў Гомелі, Мінску, Вільнюсе, Бранску, Калінінградзе і Маскве.**

***— Кажучы мовай кулінарыі, якіх прыпраў ці інгрэдыентаў не хапае страве з назвай «Тэатр Беларусі»?***

— Не хапае добрай школы. (Хоць ёсць руская тэатральная школа, на якую раўняецца ўвесь свет. І ў якой я вучыўся.) Дзіўныя крытэрыі ацэнкі. Напрыклад, калі глядач фестывалю «М.@рт. кантакт-2016» у Магілёве горача прымае спектакль «Рэўнасць», то крытыкі чамусьці называюць гэта масавай культурай. Калі мы прапанаваў гэтаму ж фестывалю наш унікальны музычны праект «Легіянер» пра Эдыт Піаф, то гэты фармат, у якім амаль ніхто не працуе, таксама быў адкінуты арганізатарамі, у прынцыпе, крытыкаў цікавяць нейкія галаваломкі ў спектаклях, а глядач з такіх проста сыходзіць.

***— Які ён — ваш глядач?***

— Мой настаўнік Барыс Утораў вучыў мяне рабіць спектакль так, каб на 95 працэнтаў ён быў камедыяй і толькі на 5 — трагедыяй. Каб людзі шмат смяяліся, але плакалі ў канцы. Таму мой глядач — гэта глядач з добрым пачуццём гумару.

**Алена ПАРФІЯНОВІЧ.**

■ Вернісаж

# ПЕРАЕМНАСЦЬ ПАКАЛЕННЯЎ

## На выстаўцы «Школа класікаў. Беларускае і рускае мастацтва XIX—XX стагоддзяў»

**Мастацтва, якое стваралася на працягу амаль двухсот гадоў, больш як 80 твораў жывапісу і графікі ў чатырох залах гэта ўсё экспазіцыя «Школа класікаў. Беларускае і рускае мастацтва XIX—XX стагоддзяў». Вернісаж прайшоў 6 чэрвеня ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь у рамках праекта «Нашы калекцыі».**

Побач размясціліся работы настаўнікаў, прафесараў Акадэміі мастацтваў у Санкт-Пецярбургу і Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў (у савецкі час — Тэатральна-мастацкага інстытута) і іх вучняў, не менш таленавітых і вядомых. Пераемнасць традыцый з афарбоўкай у індывідуальныя колеры, нараджэнне новых тэндэнцый у жывапісе, працэс змены стыляў і тэм — гэта ў экспазіцыі добра прасочваецца.

Асобныя работы ўжо даўно не экспанаваліся. Некаторыя карціны класічныя, нават акадэмічныя, але гэта не адмяняе іх бясспрэчнай каштоўнасці.

Каго можна ўбачыць на выстаўцы? Многія беларускія імёны, нягледзячы на іх вядомасць, гледачы адкрыюць упершыню. Многія мастакі з'язджалі за мяжу, а потым іх лічылі ці то палякамі, ці то рускімі.

Ці ведалі вы пра Максіма Вараб'ёва? Яго называлі майстрам пецярбургскіх пейзажаў. Петрапаўлаўская крэпасць або Ісакіеўскі сабор на яго карцінах – як фотаздымкі з паштовак, рамантычныя і вобразныя. Час росквіту творчасці – 1820—1840-я гады. Яго работы маюць дакументальную каштоўнасць, яны загадкавыя і прыцягальныя. Начная прыстань Нявы з егіпецкімі сфінксамі – нібы кадр з фільма «нуар».

А вось славуты беларус Іван Хруцкі, ураджэнец мястэчка Ула Лепельскага павета Віцебскай губерні, які ўзвысіў жанр нацюрморта, стаў яго заканадаўцам з трапяткім стаўленнем да дэталізацыі, выразнасці і ўрачыстасці. Але ў яго спадчыне ёсць нават іконы, шмат сямейных і жаночых партрэтаў, вельмі пышчотных, вытанчаных.



І. Хруцкі. Дзяўчынка ў блакітнай сукенцы. Сярэдзіна 1840-х.

Яшчэ адзін прадстаўлены жывапісец, што стаіць на мяжы «рускі-беларус», — Апалінарый Гараўскі. Нарадзіўся ў збяднелай шляхецкай сям'і. Вучыўся ў Брэст-Літоўскім кадэцкім корпусе. А потым лёс нечакана занёс яго ў Пецярбургскую акадэмію мастацтваў. На тыя часы лепш было вучыцца ў Вільні ці горадзе на Няве, бо ў Беларусі яшчэ не было добрых умоў для мастакоў. Адна з першых карцін Гараўскага «Балота», напісаная на радзіме, была набыта царскай сям'ёй для асабістай калекцыі. У мастацкім музеі сёння каля 40 яго карцін, каля ўваходу ў экспазіцыю — некалькі графічных эцюдаў.

Напэўна, вы спыніцеся перад карцінамі Архіпа Куінджы. Яго пейзажы з шэрагу містычных. Традыцыйныя і незвычайныя адначасова, задзірліва глыбокія і стройныя, велічныя ў сваёй цішыні, з цёплымі дарожкамі святла, што прабіваецца паміж дрэвамі і хвалямі вады... Такі яго «Бярозавы гай». Так, справа менавіта ў майстэрстве стварэння светлавых ліній і пераходаў. Вучыўся Куінджы, дарэчы, у Айвазоўскага. А адзін з вучняў майстра — Мікалай Рэрых. За аснову творчасці лічыў пазнанне прыроды, а не яе сляпое капіраванне.

Чароўнасць акварэлі — у творах Фёдара Ясноўскага. Ён ажыўляе на палотнах нават камяні. Акадэмік акварэльнага арнаментальнага жывапісу. Горад ці вёска, пахмурныя альбо асветленыя сонцам мясціны — яго карціны па экспрэсіі нагадваюць імпрэсіяністаў. Ім, безумоўна, верыш.

Гіпнатызуюць партрэты Сяргея Заранка палымяны позірк грузінскай княгіні ці станістага пажылога мужчыны ў дарагім, аблямаваным футрам халаце. У перадзвіжніка Абрама Архіпава іншыя персанажы ? чырванашчокія, у яркіх сукенках, мажныя панянкі, што так і дыхаюць здароўем і шчасцем.

У пазалочанай раме — жоўтае поле Палесся ў перыяд жніва ад... Івана Шышкіна, знаўцы адметных рысаў дрэў, кустоў і траў і аддана прыхільніка фатаграфічнай дасканаласці. Яго ідэі падхоплівае Вітольд Бялыніцкі-Біруля, аўтар лірычных і тонкіх пейзажаў. У экспазіцыі прадстаўлены яго карціны «Хмурны дзень» і «Блакітнай вясной», зусім розныя па настроі і палітры, таму іх цікава параўнаць.

Асаблівая ўвага надаецца карціне Фердынанда Рушчыца «Ля касцёла», напісанай у 1899 годзе. Яна адзіная, напісаная гэтым мастаком у Беларусі. Сіняе вясновае неба і вернікі. Мы бачым іх спіны, але добра адчуваем энергетыку — у навакольным сонечным настроі, веснавым надвор'і, мяккіх аблоках. Наш зямляк з'явіўся на свет пад Ашмянамі. Спачатку майстэрству вучыўся ў Шышкіна і Куінджы, а потым праславіўся яшчэ і як афарміцель спектакляў, кніжны графік і ілюстратар. Такая ўніверсальнасць вылучае многіх мастакоў таго часу.

«Кравец» легендарнага Юдаля Пэна... міма гэтай карціны не пройдзеш. Беларускі мастак, адзін з самых прыкметных дзеячаў «яўрэйскага рэнесансу», настаўнік Марка Шагала.

Работ апошняга на выставе няма, затое на сценах шчырасць прыроды, пазбаўленая пышнасці і дэкаратыўнасці ад Станіслава Жукоўскага, велічнае палатно «Зямля беларуская» ад Паўла Масленікава, напісанае ўжо амаль у 1980-я, у час перамен. Яны адчуваюцца на карціне, быццам павісလі ў насычаным паветры, згрупаваных аблоках, сакавітай зямлі. Зачароўвае «Жнівень» ураджэнца магілёўскай зямлі, народнага мастака Беларусі Віктара Грамыкі. Гэта таксама амаль сярэдзіна XX стагоддзя. Побач — зямля саligорская Мая Данцыга. І, уласна, «XX стагоддзе. 1980-я» Міхаіла Савіцкага. Сацыяльнае выходзіць на першы план. Смеласць ідзе поруч з асабістай інтэрпрэтацыяй. Час змяняе мастацтва, каб яно само ператварыла рэчаіснасць.

Выстаўка доўжыцца да 7 жніўня.

**Марыя ВОЙЦІК**